# Уводзіны

У слоўнік уключана дыялектная лексіка гаворак Гродзеншчыны. Апорныя словы падаюцца ў алфавітным парадку ў літаратурным запісе, ілюстрацыйны матэрыял прыводзіцца ў фанетычнай транскрыпцыі, указваюцца населеныя пункты, дзе сабрана лексіка. Пасля загалоўнага слова даюцца граматычныя і стылістычныя паметы, затым прыводзіцца тлумачэнне значэння слова або яго літаратурны адпаведнік. У алфавітным парадку па першаму слову падаюцца складаныя назвы.

Фанетычная транскрыпцыя выкарыстана па «Праграме па вывучэнню беларускіх гаворак і збіранню звестак для складання Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы». Галосныя гукі абазначаюцца літарамі и, е, е, а, о, о, у, ы, ъ, ь; літарамі ê, ô перадаюцца закрытыя галосныя, якія ўжываюцца пад націскам. Літарай й перадаецца палатальны сярэднеязычны гук: йама, йелка, майо; літара г абазначае заднеязычны фрыкатыўны гук: пагода, гара; адпаведны заднеязычны выбухны гук абазначаецца літарай ґ: ґонты, ґанак. Мяккасць зычных абазначаецца знакам ', які ставіцца справа зверху ад зычнай літары: в'оў, кон', м'éс'ац. Доўгія гукі перадаюцца падвойным іх напісаннем: каλóс'с'е, суччó.

Аднесенасць населеных пунктаў да пэўнага раёна даецца паводле адміністрацыйнага падзелу, які існуе з 1963 года.

Лексіка, змешчаная ў працы, выяўлялася і запісвалася пры даследаванні вуснай мовы асоб, тыповых носьбітаў гаворак Гродзеншчыны. Пераважную большасць складае прадметная лексіка, другое месца займае дзеяслоўная. Ілюстрацыйныя прыклады ўзяты з розных раёнаў вобласці.

Насельніцтва Гродзенскай вобласці гаворыць на такой жа мове, як і ўвесь беларускі народ, аднак частка слоў, якімі карыстаюцца жыхары вобласці, уласціва толькі мясцовым гаворкам, таму ў дадзены слоўнік увайшлі словы, якія характарызуюць лексічную спецыфіку гаворак Гродзеншчыны. За апошнія дзесяцігоддзі ў сувязі з культурным ростам калгаснага сялянства адбываецца пераход ад сістэмы традыцыйных гаворак да мовы перадавых груп сельскага насельніцтва. Побач са словамі, якія адлюстроўваюць паняцці і прадметы старога жыцця, у слоўнік унесены словы, увайшоўшыя ва ўжыванне пасля ўз'яднання заходніх абласцей Беларусі ў адзінай братняй сям'і і пасля Вялікай Айчыннай вайны. Гэтыя словы звязаны з назвамі перадавой тэхнікі, з новымі грамадска-палітычнымі адносінамі, з сацыялістычнай вытворчасцю і культурай.

У слоўніку падаецца пэўная колькасць слоў-паланізмаў. Гэта тлумачыцца непасрэднай блізкасцю вобласці да Польскай Народнай Рэспублікі, кантактам з прадстаўнікамі польскіх гаворак. Гэтыя словы не з'яўляюцца агульнанароднымі і разглядаюцца як дыялектызмы, таму што набылі фанетычныя або марфалагічныя рысы мясцовай гаворкі.

Прыведзены ў даным слоўніку матэрыял не вычэрпвае лексіку Гродзеншчыны, але дае ілюстрацыю пэўнай часткі лексікі гаворак.

Прыводзяцца наступныя граматычныя паметы. Для назоўнікаў указваецца род. Для дзеясловаў указваецца трыванне. Дзеепрыметнікам і дзеепрыслоўям прысвячаюцца самастойныя слоўнікавыя артыкулы. Указваецца назва ўсіх астатніх часцін мовы.

З сэнсавай характарыстыкай слова звязаны паметы, якія азначаюць слова або асобныя яго значэнні ў слоўнікавых артыкулах.径аметай «устарэлае» ўказваецца на архаічны стан слова ў сучаснай лексічнай сістэме гаворак. Некаторыя паметы ўказваюць на наяўнасць у слове ўстойлівай эмацыянальнай афарбоўкі. Так, словы, ужытыя з ласкальнай афарбоўкай, маюць памету ласк. Словы, ужытыя з іранічным

адценнем, маюць памету іран. Словы, ужытыя ў пераносным сэнсе, адзначаюцца паметай перан.

Словы-амонімы змяшчаюцца ў асобных артыкулах. Калі адно паняцце або прадмет мае некалькі назваў, гэтыя назвы змяшчаюцца ў адным артыкуле.

Гродзенскія гаворкі ўваходзяць у склад паўднёва-заходняга дыялекта беларускай мовы. Для іх характэрны наступныя рысы.

Недысімілятыўнае аканне ў першым пераднаціскным складзе пасля цвёрдых зычных: нагá, пашлá, вадá.

Захаванне галоснага ы ў першым пераднаціскным складзе: рыбáк, былá, дывáн, плылá.

Недысімілятыўнае яканне ў першым пераднаціскным складзе пасля мяккага зычнага: в’алá, л’аглá, дз’ажá, с’астрá.

Адрозніванне галосных о і а ў канцавым адкрытым складзе пасля цвёрдых зычных /няпоўнае аканне/: сáло, лéто, б’арóза, с’ͅйла. У гаворках паўночных раёнаў Гродзенскай вобласці ў гэтай пазіцыі адсутнічае адрозніванне галосных о і а: сáла, с’ͅйла.

Двухскладовы канчатак творнага склону адзіночнага ліку назоўнікаў жаночага роду на -а з галосным о пасля цвёрдых зычных: с’ц’анóйу, галавóйу, травóйу; з галосным о на поўначы і галосным е на поўдні пасля мяккіх і зацвярдзелых зычных: з’амл’óйу, м’ажóйу, шашóйу; з’амл’éйу, м’ажéйу.

На месцы о ў другім складзе перад націскам пасля цвёрдых зычных і ў суседстве з губнымі зычнымі — галосны а: галавá, памагý.

На месцы е ў другім складзе перад націскам у прыстаўцы пера- ў асноўным застаецца галосны е: перан’éс’ц’и, п’ерайдý.

На месцы е ў трэцім складзе перад націскам вымаўляецца а: в’арац’анó, з’ал’анавáты, зрэдку сустракаецца е: в’ел’икавáты.

У першым складзе перад націскам у пазіцыі каля губных захоўваецца галосны ы: мычы́ц’, грымзýл’, бывáй.

У паслянаціскным закрытым складзе ў аснове слова на месцы е — галосны а: хлóп’ац, бýс’ал, грéб’ан’, дáл’ай.

На месцы е ў паслянаціскным неканцавым адкрытым складзе — галосны а: в’éс’ала, вóз’аро, сóл’ана, але сустракаецца і ’е: с’óл’ета.

На месцы е ў канцавым адкрытым складзе ў форме назоўна-вінавальнага склону адзіночнага ліку ніякага роду з мяккай асновай ужываецца галосны о: з’éл’о, нас’éн’о, пóл’о; у паўночна-ўсходняй частцы гаворак — галосны а: з’éл’л’а, пóл’а.

Ва ўсіх гаворках вобласці ўжываецца цвёрдае р: куры́ц’, крук.

Неадрозніванне глухіх — звонкіх зычных у канцы і ў сярэдзіне слова, калі звонкія стаяць перад глухімі: гóлуп, зуп, клáтка, лоп.

Наяўнасць мяккіх губных у пазіцыі перад а, и, е: п’ац’, м’áса, м’áта, п’иц’, б’иц’, м’éс’ац’.

Наяўнасць мяккіх з’, с’, дз’, ц’ перад е, и: с’éм’а, з’éл’о, дз’éц’и, ц’ͅйхо, але сéрца.

Спалучэнне дн у гаворках паўднёвага захаду вобласці вымаўляецца як нн: хóланна, аннó.

На месцы старога спалучэння «зычны перад ьй» у гаворках ужываецца фанетычнае падоўжанне зычных: кам’éн’н’а, збóжжа, суччó, калóс’с’а. На паўднёвым захадзе вобласці такое фанетычнае падоўжанне зычных адсутнічае: нас’éн’о, кам’éн’о, пáкул’о, з’éл’о.

У давальным і месным склонах адзіночнага ліку назоўнікаў жаночага роду зычныя асновы г, к, х чаргуюцца са свісцячымі з, ц, с: на наз’é, на руцé, мýс’а.

Націскны канчатак -е ў назоўным склоне множнага ліку назоўнікаў мужчынскага роду з асновай на цвёрды, мяккі, зацвярдзелы і заднеязычны зычны і жано-

чага роду з асновай на -к: дз'адé, сталé, дубé, кавал'é, хаз'айé, стаг'é, кашé, жанк'é, дз'аўк'é. У паўночна-ўсходняй частцы гаворак — канчатак -ы; -і: сталы́, дубы́, кавалí, нажы́, дз'éўк'и.

У месным склоне адзіночнага ліку назоўнікаў трох родаў і давальным склоне адзіночнага ліку назоўнікаў жаночага роду з цвёрдай асновай у большасці выпадкаў вымаўляецца -и: у л'éс'и, на балóц'и, у хáц'и; на паўночным усходзе вобласці ў гэтых формах вымаўляецца -а: у л'éс'а, у хáц'а.

Націскны канчатак -е ў месным склоне адзіночнага ліку маюць назоўнікі 2-3-га скланення з мяккімі і зацвярдзелымі асновамі: на даждже́, на кан'é, у в'адрé, па начé.

У давальным і месным склонах назоўнікаў мужчынскага роду ўжываюцца націскныя канчаткі -ом, -ох: братóм, братóх, гарадóм, гарадóх, сталóм, сталóх.

Канчатак -оя, -ая, -яя ў прыметніках ніякага роду адзіночнага ліку назоўнага склону: старóйа дрéво, нóвайа в'адрó, с'ún'айа н'éбо.

Націскны канчатак -ом у месным склоне адзіночнага ліку прыметнікаў і займеннікаў мужчынскага і ніякага роду: у маладóм, у старóм, у том, у такóм, у сухóм, у глухóм.

Побач з поўнымі формамі наяўнасць сцягнутых форм прыметнікаў і займеннікаў у вінавальным склоне адзіночнага ліку жаночага роду: стáру п'éс'н'у, дóўгу ноч.

Побач з прыналежнымі прыметнікамі свіны́, куры́ны, карóвін ужываюцца прыметнікі карóвячы, курáчы.

Пашырана ўжыванне лічэбнікаў тыпу: паўтрац'á, паўчвартá.

Форма роднага склону адзіночнага ліку мужчынскага і ніякага роду прыналежных займеннікаў: мой, твой, свой — майгó, твайгó, свайгó; у гаворках заходняй часткі вобласці — магó, твагó, свагó.

Форма роднага склону адзіночнага ліку жаночага роду прыналежных займеннікаў мая, твая, свая — у майé, у твайé, у свайé: у паўночна-ўсходніх гаворках вобласці — у майéй, у твайéй, у свайéй.

Форма 3-й асобы адзіночнага ліку дзеясловаў 1-га спражэння з націскным -е на канцы: пяйé, идз'é, н'ас'é. На паўночнай ускраіне вобласці, у гаворках Астравецкага, Смаргонскага, Ашмянскага раёнаў — форма -ець: п'айéц', н'ас'éц', идз'éц'.

Форма 3-й асобы адзіночнага ліку дзеясловаў 1-га спражэння з націскам на аснове з канцавым -а: грéйа, скáжа, м'éл'а. У гаворках паўночных раёнаў вобласці — формы -аць, -'аць: скáжац', грéйац', пац'éйац'.

Форма 3-й асобы адзіночнага ліку дзеясловаў 2-га спражэння з націскам на аснове — -'иць: нóс'иць, вóз'иць, кóс'иць. У паўночных гаворках вобласці — форма -а, -'а: гавора, нóс'а, хóдз'а.

Форма 1-й асобы множнага ліку дзеясловаў 1-га спражэння пад націскам з чаргаваннем цвёрдых і мяккіх парных зычных або заднеязычных і шыпячых -ем, -'ем: идз'éм, н'ас'éм, п'ачéм. Форма 1-й асобы множнага ліку дзеясловаў цяперашняга часу або будучага простага з ненаціскным канчаткам -'ам, -ам: кáжам, мóжам, кóл'ам, знáйам, зм'éл'ам, пóл'ам.

Форма на -мо пад націскам у дзеясловах 1-й асобы множнага ліку цяперашняга або будучага простага часу 2-га спражэння: с'адз'имó, пастайимó, л'ажымó; у паўночнай частцы гаворак — форма -им: с'адз'и́м, гл'адз'и́м, пастайи́м.

Форма дзеясловаў 2-й асобы множнага ліку цяперашняга часу з канцавым націскным е — -ац'е, -иц'е: н'ас'ац'é, б'арац'é, с'адз'ц'é, л'ац'иц'é.

Ненаціскны канчатак 3-й асобы множнага ліку дзеясловаў 2-га спражэння — -'аць, -аць: хóдз'ац', вóз'ац', гавóрац', прóс'ац'.

Форма 2-й асобы множнага ліку загаднага ладу дзеясловаў 1-га спражэння — -'ец'а -ец'а пад націскам: б'éц'а, п'éц'а, н'ас'éц'а, в'адз'éц'а, станав'éц'а; кажéц'а, б'арéц'а, хадз'éц'а.

У дзеясловах 2-й асобы множнага ліку загаднага ладу з націскной асновай на шыпячую адзначаецца форма -ча: йе́шча, ма́шча, зва́шча, л’а́шча.

Утварэнне форм будучага часу незакончанага трывання адбываецца з дапамогай дзеяслова «буду»: буду с’адз’е́ц’, бу́дз’ем раб’и́ц’. У паўднёвай частцы гаворак сустракаецца форма будучага часу незакончанага трывання з дапамогай дзеяслова «иму» сінтэтычнага выражэння: хады́тыму, хады́тым’еш, каза́тыму, каза́тым’еш.

Дзеяслоў «ёсць» ужываецца ў формах йе, йо, йес’ц’, йос’ц’, йест.

На ўсёй тэрыторыі вобласці пераважна ўжываецца галосны ’а пасля мяккага с’ у зваротнай часціцы дзеясловаў: с’м’айу́с’а, с’п’аша́йус’а, сустрака́ўс’а. У гаворках паўднёвай і цэнтральнай частках вобласці сустракаецца галосны ’о, о пасля с у зваротнай часціцы дзеясловаў: байу́со, байу́с’о, с’м’айу́с’о.

Сустракаецца форма старога парнага ліку назоўнікаў жаночага і ніякага роду: дз’в’е в’адре́, аб’е́дз’в’ийа руце́, дз’в’е с’ц’ан’е́.

Ужываецца канструкцыя з родным склонам у ролі дапаўнення: знайшо́ў гры́ба, ваз’м’и́ каша́, зав’адз’и́ тра́ктара.

У гаворках Гродзенскай вобласці ўжываюцца арыгінальныя прыслоўі: узаўтра, был’а-куды́, бал’а-йа́к, кадз’е́, кал’ин’е́йачы, л’е́тко, лише́н’, л’а́вай, л’адайа́к, л’у́дско і г.д.

У паўночных гаворках вобласці часта ўжываецца дзеепрыслоўе ў ролі выказніка: Жо́нка пайшо́ўшы ў по́л’а. Каб быў с’еўшы ў той арбо́н, то н’и стайа́ў бы /Астр./.